Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

# АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ СУЧАСНАЙ НАВУКІ

Зборнік навуковых прац

Мінск 2016

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прямыми и косвенными, которые выполняют особо охраняемые природные территории:

- развитие экотуризма;
- научные исследования и экологическое просвещение;
- занятость населения;
- увеличение потока информации о защищаемом районе и смежных территориях;
- международная интеграция;
- ООПТ способствуют привлечению прямых инвестиций и др. [2].

При этом необходимо отметить, что институциональные механизмы развития системы особо охраняемых природных территорий не способны самостоятельно решить все экологические проблемы, существующие в стране. Значительную часть экологических проблем можно решить экономическими механизмами. Только оптимальное сочетание институциональных и экономических механизмов регулирования природоохранной деятельности позволяет решать актуальные вопросы, связанные с экологическими проблемами, в том числе и глобальными, и позволит минимизировать вредное воздействие экономической деятельности человека на окружающую среду в будущем.

### *Литература*

1. Лукашенко, А. Г. Сила в движении. Вступительное слово и доклад Президента «Вместе – за сильную и процветающую Беларусь» на V Всебелорусском народном собрании» / А. Г. Лукашенко // Советская Беларусь. – 2016. – 23 июня. – С. 7.

2. Горкавчук, П. В. Социально-экономические функции природоохранных территорий на примере Березинского биосферного заповедника / П. В. Горкавчук // Весці БДПУ Сер. 2, Паліталогія. Эканоміка. Сацыялогія. – 2016. – № 1. – С. 51–54.

3. Давыденко, Л. Н. Институционализация рынка природных ресурсов / Л. Н. Давыденко. – Минск : ИВЦ Минфина, 2014. – 255 с.

4. Закон Республики Беларусь об охране окружающей среды от 26 ноября 1992 г. № 1982–XII [электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.pravo.by/main.aspx?guid=3871&p2=2/360. – Дата доступа 18.12.2015 г.

5. Национальные счета Республики Беларусь 2016. Статистический сборник. – Минск, 2016.

6. Об утверждении Государственной программы развития системы особо охраняемых природных территорий на 2015–2019 годы. Указ Президента Республики Беларусь от 24 июля 2014 г. № 367.

7. Официальный сайт Министерства природных ресурсов и охраны окружающей среды. – Режим доступа: http://minpriroda.gov.by. – Дата доступа: 18.12.2015 г.



УДК 94(476):34(091)(476)"18/19"

## ДЗЕЙНАСЦЬ СУДОВЫХ ОРГАНАЎ БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ГУБЕРНЯЎ ПА ВЫРАШЭННІ КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАЎ ЭКАНАМІЧНАГА ХАРАКТАРУ Ў АПОШНЯЙ ТРЭЦІ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

## THE ACTIVITY OF JUDICIAL BODIES OF BELARUSIAN-LITHUANIAN PROVINCES FOR CONSIDERATION OF *CASES* OF *ECONOMICALLY MOTIVATED CRIMES* IN THE LAST THIRD OF THE 19TH – THE BEGINNING OF THE 20TH CENTURY

І. Г. Гушчынскі

I. Hushchynski

*На этапе станаўлення і развіцця капіталістычных сацыяльна-эканамічных адносін асабліва важнае значэнне набывала эфектыўнасць функцыянавання судовай сістэмы, якая павінна была гарантаваць маёмасныя правы насельніцтва і суб'ектаў гаспадарання. Гэта датычыла не толькі судаводства па грамадзянскіхісках, але і разгляду некаторых катэгорый крымінальных спраў, якія ўзнікалі на эканамічнай глебе*

*The efficiency of functioning of judicial system was essential to genesis and development of capitalism, particularly to economic, social and political modernization of the society. Judicial bodies had to guarantee property rights of people and business entities. This applies not only to activity of courts for consideration of civil actions, but also criminal cases of economically motivated crimes*

Перыяд апошняй трэці XIX – пачатку XX ст. у гісторыі Беларусі адметны інтэнсіўнымі працэсамі мадэрнізацыі грамадства, у прыватнасці, станаўленнем і развіццём капіталістычных сацыяльна-эканамічных адносін. У дадзеным кантэксце асабліва важнае значэнне набывала эфектыўнасць функцыянавання судовай сістэмы, якая павінна была гарантаваць маёмасныя правы насельніцтва і суб'ектаў гаспадарання. Гэта датычыла не толькі судаводства па грамадзянскіхісках, але і разгляду некаторых катэгорый крымінальных спраў. Караючы вінаватых у злачынствах, накіраваных супраць чужой маёмасці (крадзяжах, разбоях, знішчэнні маёмасці, незаконным карыстанні ёю, зямельных захопах, супраць ляснога статута, махлярстве, фальшываманецтве і г. д.), суды выконвалі функцыю рэгулявання фінансава-эканамічных і маёмасных адносін у грамадстве.

Згаданыя катэгорыі злачынстваў здзяйсняліся ў вялікай колькасці, якая пастаянна ўзрастала. У канцы XIX – пачатку XX ст. дынаміка руху крымінальных спраў катэгорыі «Супраць маёмасці прыватных асоб» (арт. 1607–1711 Улажэння аб пакараннях) была наступнай: у 1890 г. у судовых установах 5-ці заходніх губерняў (Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай, Віленскай) іх узнікла 6132, у 1894 г. – 6487, 1899 г. – 7420, 1903 г. – 10372, 1905 г. – 13556 [1, арк. 91]. Такім чынам, толькі за адзначаны перыяд узровень дадзенага віду злачыннасці ўзрос больш чым у 2 разы. Акрамя таго, значная колькасць



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

злачынстваў здзяйснялася супраць казённай і царкоўнай уласнасці. А калі ўлічыць, што на маёмаснай глебе ўзнікалі шматлікія справы аб непадпарадкаванні і супраціўленні ўладам, абразах яе прадстаўнікоў, аб нанясенні пабояў ці калецтваў іншым асобам, забойствах і інш., можна зрабіць выснову: злачынствы, у аснове якіх ляжаў эканамічны фактар, складалі большую частку ад агульнай сумы. Судовыя ўстановы, караючы вінаватых па такіх крымінальных справах, з'яўляліся галоўным гарантам эканамічных правоў як грамадзян, так і казны. У дадзеным кантэксце трэба адзначыць, што па злачынствах супраць чужой уласнасці паказчык прызнаных судамі вінаватымі адносна агульнай колькасці падсудных быў на парадак вышэйшым, чым па злачынствах супраць жыцця, здароўя і свабоды асобы. Напрыклад, калі па першых Мінскім акруговым судом у 1884–1886 гг. вызвалена з-пад суда ці апраўдана было ўсяго 28,8 % падсудных, то па апошніх – 57,3 % [1, дадатак Ж].

Вялікая колькасць злачынстваў аб знішчэнні чужой маёмасці стала вынікам сацыяльнай варожасці: падпалы будынкаў, лесу, сена, атручванні жывёлы, патравы і г. д. Хаця апошнія не ў меншай ступені былі следствам практычнай патрэбнасці сялян у пашах. Высокі ўзровень дадзенай катэгорыі злачыннасці назіраўся ў другой палове 80-х гг. XIX ст. У 1885–1889 гг. па адпаведных артыкулах Улажэння аб пакараннях агульнымі судовымі ўстановамі (акруговымі судамі і судовай палатай) 5-ці заходніх губерняў было асуджана 319 чалавек. На працягу наступных 15 гадоў адбывалася паступовае зніжэнне колькасці пакараных згаданымі судамі за знішчэнне чужой маёмасці: у 1890–1894 гг. іх было 287, у 1895–1899 гг. – 215, у 1900–1904 гг. – 188 [1, дадатак К]. Дадзеная дынаміка была следствам пэўнага спаду напружанасці ў вёсцы ў гэты час. Колькасць асуджаных за гэтыя злачынствы значна ўзрасла падчас рэвалюцыі і ў першыя паслярэвалюцыйныя гады. У 1905–1908 гг. дадзены паказчык па агульных судовых установах 5-ці заходніх губерняў склаў 326 чалавек, што на 73,4 % больш, чым за папярэднія пяць гадоў [1, дадатак К]. Улічваючы, што такія справы былі даволі складанымі для следства, а затым яшчэ нярэдка доўгі час разглядаліся судом, пік росту дадзенай катэгорыі злачыннасці можна аднесці менавіта на перыяд рэвалюцыі. У 1910–1913 гг. колькасць прызнаных адзначанымі судамі вінаватымі ў знішчэнні чужой маёмасці хаця некалькі знізілася, але заставалася на даволі высокім узроўні: 62–67 асуджаных штогод [1, дадатак К]. Пакаранні па такіх справах былі даволі жорсткімі. 24 з 40 (60 %) асуджаных Мінскім акруговым судом у 1884–1886 гг. па арт. 1606–1625 («Аб знішчэнні і пашкоджванні чужой маёмасці») Улажэння аб пакараннях былі прыгавораны да ссылкі на катаржныя работы альбо пасяленне ў Сібір і на Каўказ [1, дадатак В]. З ліку гэтых злачынстваў найбольш жорсткія прыгаворы выносіліся па справах аб падпалах жылых будынкаў. Так, сяляне сяла Манчыц Мазырскага павета Нікадзім Несцерня і Іван Заяц за падпал у 1895 г. хаты лесніка графа



Тышкевіча Арсенія Жогла (з-за таго, што ён іх неаднаразова лавіў за самавольным паляваннем і прыцягваў за гэта да суда) былі прыгавораны Мінскім акруговым судом да пазбаўлення ўсіх правоў стану і ссылкі на катаржныя работы на 4 гады кожны [4, арк. 33]. Пазбаўленне ўсіх правоў стану і высылка на пасяленне ў аддаленыя раёны Сібіры было прысуджана селяніну Матвею Ханькоўскаму. Летам 1890 г. ён працаваў пастухом у маёнтку князя Радзівіла Гусакі Наваградскага павета, але пасля таго, як па яго віне была дапушчана патрава сялянскіх угоддзяў, за што было выплачана 50 руб., быў пазбаўлены жалавання і звольнены. У помсту ён падпаліў у княжацкім маёнтку гумно, 2 фермы для жывёлы і аўчарню з 659 авечкамі [3, арк. 33–34].

Нераўнамернае размеркаванне ўласнасці на зямельныя і лясныя ўгоддзі ў разглядаемы перыяд вяло да ўзнікнення ў судах вялікай колькасці спраў, звязаных з канфліктамі на гэтай глебе. Непасрэдна злачынствы супраць чужой зямельнай уласнасці падпадалі пад катэгорыю «Гвалтоўнае вымаганне ці гвалтоўны захоп» (арт. 1601–1603, 1605 Улажэння аб пакараннях). Па большай частцы гэта былі крымінальныя справы аб знішчэнні межавых знакаў і заворванні чужой зямлі. Пік колькасці асуджаных па такіх справах прыходзіцца на другую палову 80-х – пачатак 90-х гг. XIX ст. За перыяд з 1885 па 1913 г. агульнымі судовымі ўстановамі 5-ці заходніх вінаватымі ў здзяйсненні дадзеных злачынстваў было прызнана 269 чалавек, з якіх 175 (65,1 %) прыходзіцца на 1886–1893 гг. [1, дадатак К]. Прыкладна пасля 1893 г. назіраецца скарачэнне колькасці судовых спраў, якія ўзніклі на глебе пазямельных адносін. Гэта было звязана з часовым спадам сацыяльнай напружанасці ў выніку эканамічнага ўздыму. Акрамя таго, да гэтага часу большая частка сялянскіх і памешчыцкіх надзелаў была ўжо размежавана. А менавіта падчас правядзення такіх размежаванняў узнікалі шматлікія канфлікты. У наступным пэўны ўсплёск колькасці спраў, якія ўзніклі на глебе пазямельных адносін, назіраўся ў рэвалюцыйным 1906 г., а таксама ў 1909–1912 гг. [1, дадатак Л]. Апошняе ў значнай ступені было звязана з дзейнасцю ўрада па рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы. Сяляне зачастую аказвалі супраціўленне прадстаўнікам улады пры правядзенні імі землеўпарадкавальных работ па падзелу зямлі на хутарскія ўчасткі [10].

Уласнасць на лясныя ўгоддзі, як і зямлю, размяркоўвалася крайне нераўнамерна. Сяляне практычна не мелі ўласнага лесу і адчувалі значны недахоп паліва і будаўнічых матэрыялаў. Гэта таксама вяло да ўзнікнення вялікай колькасці крымінальных спраў. Большасць злачынстваў супраць ляснога статута (аб парубках, супраціўленні лясной стражы, самавольным зборы грыбоў і ягад, паляванні і г. д.) была падсудная міравым судам. Цэнтралізаванай статыстыкі па справах, вырашаных міравымі суддзямі не вялося. Аднак у пэўнай ступені дынаміку канфліктаў, так ці інакш звязаных з гэтым, можна прасачыць на аснове статыстыкі акруговых судоў. Паводле закона ад 18 снежня 1885 г.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ім былі падсудны толькі тыя злачынствы супраць ляснога статута, у выніку якіх кошт нанесенага ўрону быў большым за 300 руб. Акрамя таго, менавіта акруговымі судамі разглядаліся справы аб нанясенні абраз і пабояў лясной стражы (хаця ў некаторых выпадках абвінавачаныя ў гэтым праходзілі па артыкулах катэгорыі «Паўстанне і супраціўленне ўладам»). Вынікам канфліктаў аб парушэнні чужых правоў на ўладаннеляснымі ўгоддзямі былі таксама наступныя злачынствы: супраціўленне валасным старшыням і чыноўнікам адміністрацыі пры пошуку імі крадзенага лесу, супраць маёмасці леснікоў, па абвінавачаннях апошніх у перавышэнні паўнамоцтваў пры затрыманнях (нанясенне пабояў, забойствы) [1, дадатак М]. Найбольшая колькасць паступлення ў суд такіх спраў назіраецца ў перыяд з 1906 па 1912 г. За гэтыя гады ў Мінскім акруговым судзе іх у суме ўзнікла 207 (у сярэднім 30 у год). Адпаведныя ж лічбы за ўвесь папярэдні перыяд дзейнасці суда (з 1884 па 1905 г.) складалі: у суме – 285, у сярэднім за год – 13 [1, дадатак М]. Дадзеная тэндэнцыя тлумачыцца перш за ўсё агульным сацыяльным выбухам падчас рэвалюцыі, адбітак якой на свядомасці насельніцтва вызначыў большую яго схільнасць да барацьбы за свае эканамічныя і грамадзянскія правы і пасля яе заканчэння. Важным фактарам было і тое, што ў выніку значнага росту насельніцтва праблема недахопу паліва і будаўнічых матэрыялаў паўстала яшчэ больш востра. Падчас рэвалюцыі парубкі памешчыцкага (радзей – казённага) лесу набылі масавы і, што адметна, арганізаваны характар (асабліва ў лістападзе 1905 – студзені 1906 г.). У некаторых выпадках на парубку выходзіла адначасова больш за 150 сялян [7, арк. 29]. Да крымінальнай адказнасці (у дадатак да кампенсацыі нанесенага ўрону па адпаведных грамадзянскіхісках) звычайна прыцягваліся толькі тыя, хто агітаваў да высечкі чужога лесу, быў зачыншчыкам, удзельнічаў у гвалтоўных дзеяннях супраць прадстаўнікоў адміністрацыі. Абвінавачванне выносілася часцей за ўсё па артыкулах 269 і 271 Улажэння аб пакараннях, якія падпадалі пад катэгорыю «Паўстанне і супраціўленне ўладам». У якасці пакарання выступала заключэнне тэрмінам ад 2 да 8 месяцаў [10]. Сведчаннем крайняга абвастрэння сацыяльнай напружанасці ў вёсцы і, у прыватнасці, «ляснога» пытання з'яўляецца павелічэнне колькасці забойстваў як сялянамі леснікоў, так і наадварот.

Да крымінальных спраў з яскрава выражанай эканамічнай матывіроўкай можна аднесці тыя, якія былі звязаны з забастоўкамі сельскагаспадарчых рабочых. На аснове аналізу справаводства крымінальных аддзяленняў Мінскага акруговага суда можна сцвярджаць, што іх падаўляючая большасць прыходзіцца на восень 1905 – лета 1906 г. [2]. Прыкладамі гэтага з'яўляюцца выступленні ў лістападзе – снежні 1905 г. сялян вёсак Рыловічы і Бродніца, а таксама Парэчскай воласці Пінскага павета, якія тлумачылі свае дзеянні наступным чынам: «Цяпер ва ўсёй Расіі забастоўка і тут павінна быць забастоўка!»; «Цяпер наш час, калі мы цяпер нічога не будзем рабіць і не будзем заяўляць аб сваіх правах, то нічога і не атрымаем» [9 арк. 4]; «І зараз па ўсёй



Расіі сяляне адбіраюць усё ў памешчыкаў» [8, арк. 2 адв.]. Акрамя таго, сяляне правакаваліся на такія дзеянні шматлікімі чуткамі, быццам надзяленне іх зямлёй за кошт памешчыцкіх уладанняў альбо хутка адбудзецца, альбо ўжо адбылося, але аб гэтым з-за змовы мясцовага начальства і землеўласнікаў не абвяшчалася [5, арк. 3]. У якасці абвінавачаных да суда па такіх справах звычайна прыцягваліся тыя, хто шляхам пагроз і нават выкарыстання гвалту прымушаў наёмных рабочых памешчыцкіх маёнткаў спыніць працу. Яны караліся, як правіла, турэмным заключэннем тэрмінам ад 6 месяцаў да 1,5 года [8, 9]. Пры гэтым прыгаворы па справах аб толькі славесных закліках да забастоўкі былі больш мяккімі – 3–4 тыдні арышту [6].

У дадзеным матэрыяле закрануты толькі некаторыя аспекты дзейнасці судовых органаў беларуска-літоўскіх губерняў па вырашэнні крымінальных спраў эканамічнага характару і выканання імі функцыі рэгулявання фінансава-эканамічных адносін у краі ў перыяд пасля ўвядзення судовай рэформы 1864 г. Дадзеная праблема патрабуе далейшага вывучэння і больш дэталёвага раскрыцця. Аднак наяўны матэрыял дазваляе зрабіць некаторыя высновы. На этапе станаўлення капіталізму і ва ўмовах інтэнсіфікацыі эканамічнага жыцця значна павышалася роля судовай сістэмы ў рэгуляванні дадзеных працэсаў. Асабліва актуальным гэта станавілася ў перыяды абвастрэння сацыяльна-эканамічных праблем і палітычнай дэстабілізацыі. Ад якасці працы сістэмы правасуддзя (прычым не толькі па вырашэнні спрэчак па грамадзянскіхісках, але і крымінальных спраў) залежала ступень абароненасці эканамічных правоў прыватных асоб і суб'ектаў гаспадарання. Гэта з'яўлялася адным з найважнейшых фактараў фарміравання пазітыўных умоў для разгортвання мадэрнізацыйных працэсаў, у тым ліку у сацыяльна-эканамічнай сферы. Увядзенне на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў у 1872–1883 гг. Судовых статутаў ад 20 лістапада 1864 г. адпавядала дадзеным задачам.

## *Літаратура*


1. Гушчынскі, І. Г. Роля судовых устаноў у палітычным жыцці і сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі (1864–1914 гг.) : дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02 / І. Г. Гушчынскі. – Мінск : БДПУ, 2011. – 170 л.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 183. Воп. 2.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 183. Воп. 2. Спр. 5638.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 183. Воп. 2. Спр. 9425.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 183. Воп. 2. Спр. 17889.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 183. Воп. 2. Спр. 18164, 18957.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 183. Воп. 2. Спр. 18224.
8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 183. Воп. 2. Спр. 18952.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 183. Воп. 2. Спр. 18956.
10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 183. Воп. 2. Спр. 22378, 22672, 23366, 25213.




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ